# У Беларусі ўпершыню пройдзе маштабная канферэнцыя па гісторыі Вялікага Княства Літоўскага

Пра гэта карэспандэнту «Звязды» паведаміў дырэктар Інстытут гісторыі Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі Вячаслаў ДАНІЛОВІЧ. Канферэнцыя будзе доўжыцца два дні – 5 і 6 лістапада.

Упершыню на такім маштабным навуковым форуме з'явіцца магчымасць разгледзець усе аспекты гісторыі Вялікага Княства Літоўскага. Палітыка, эканоміка, культура – тры асноўныя вектары даследаванняў, пра якія плануецца весці гаворку. Удзел прыме больш як 140 навукоўцаў з Беларусі, Літвы, Польшчы, Украіны, Расіі. Толькі замежных даследчыкаў будзе больш як 40.

Акрамя акадэмічных гісторыкаў, да навуковых дыспутаў далучацца іх калегі з вышэйшых навучальных устаноў краіны – усе тыя, хто займаецца пытаннямі гісторыі ВКЛ.

Пленарнае пасяджэнне распачнецца 5 лістапада а 10-й гадзіне раніцы ў вялікай зале Прэзідыума Нацыянальнай акадэміі навук. Завітаўшы крыху раней, там можна будзе наведаць выставу артэфактаў, набыць кнігі па гісторыі княства, азнаёміцца з працай рэканструктараў.

Апошнім выступоўцам першай часткі канферэнцыі стане лідар гурта «Стары Ольса», даследчык старажытнай музыкі Зміцер Сасноўскі. Тэма яго даклада – «Творчае пераасэнсаванне еўрапейскіх музычных уплываў у магнацкім і гарадскім асяроддзі Вялікага Княства Літоўскага». Гэта паведамленне будзе адбывацца ў суправаджэнні музыкі калектыву.

Беларуская даследчыца Вольга Ляўко раскажа пра ўтварэнне дзяржавы, ролю ў гэтым працэсе Полацкага княства; Валянцін Голубеў звернецца да найноўшай беларускай гістарыяграфіі ВКЛ. Польскі навуковец Ян Тэнгоўскі распавядзе пра дату і месца нараджэння Ягайлы. Андрэй Дварнічэнка з Расіі раскажа праблему палітагенэзу (фарміравання дзяржавы). Літоўскі даследчык Айва Рагаўскас выступіць з арыгінальнай тэмай, прысвечанай відаўскім працэсам (якія адбываліся над ведзьмамі) у Вялікім Княстве Літоўскім у XVI стагоддзі.

Далей праца канферэнцыі будзе падзелена на чатыры секцыі. Яны размесцяцца ў Інстытуце гісторыі, Цэнтральнай навуковай бібліятэцы і Нацыянальнай бібліятэцы. Прысутнічаць у якасці слухачоў, далучыцца да абмеркаванняў могуць усе ахвотныя.

Вячаслаў Даніловіч распавёў, як узнікла сама ідэя гэтай канферэнцыі:

– У беларускіх даследчыкаў ёсць ужо вельмі шмат напрацовак па гісторыі Вялікага Княства Літоўскага. Мы маем свой уласны погляд. Цяпер важна данесці яго да іншых калег. Таму мы і запрасілі замежных навукоўцаў, каб даць магчымасць ім пачуць нашы высновы. Мы імкнуліся стварыць гэта шырокае поле для дыялогу, каб данесці свае ідэі.

**Ніна Шчарбачэвіч**